DOI 10.33294/2523-4234-2019-29-1-285-299

**Галіна Флікоп-Світа**

# Іканастасы і прысценныя алтары ў грэка-каталіцкіх цэрквах Брэсцкага афіцыялату ў XVIII ст.: асаблівасці суіснавання

Даследуюцца інтэр’еры грэка-каталіцкіх цэркваў Брэсцкага афіцыялату Уладзіміра-Брэсцкай епархіі. На аснове гістарычных дакументаў ад 1720-ых гадоў да пачатку XIX ст. былі прасочаны змены ва ўнутраным уладкаванні цэркваў. У выніку даследавання было ўстаноўлена, што да другой чвэрці XVIII ст. у шэрагу храмаў інтэр’ер захоўваўся ў ранейшым выглядзе, сфарміраваным на грэчаскі лад. За другую чвэрць гэтага стагоддзя змены, якія адбываліся, пераважна датычыліся з’яўлення бакавых алтароў, а пры гэтым даволі часта працягвалі захоўвацца іканастасы. А вось у канцы XVIII ст. – пачатку XIX ст. ужо больш храмаў былі абсталяваны на лацінскі лад. Ня гледзячы на гэтыя змены, паказальна, што ў Брэсцкім афіцыялаце да моманту скасавання Уніі даволі шмат храмаў, у параўнанні з цэрквамі іншых епархій, захоўвалі іканастасы.

*Ключавыя словы*: грэка-каталіцкая царква, уніяцкая царква, Брэсцкі афіцыялат, Уладзіміра-Брэсцкая уніяцкая епархія, інтэр’ер храма, іканастас, прысценны алтар, фератрон

**Галина Флікоп-Світа**

**Іконостаси та пристінні вівтарі в греко-католицьких церквах Брестського офіціалату в XVII ст.: особливості співіснування**

Досліджуються інтер’єри греко-католицьких церков Брестського офіціалату Володимиро-Брестської єпархії. Досі комплексне вивчення оснащення храмів зазначеної територіально-адміністративної одиниці не проводилося. На основі історичних документів від 1720-х рр. до початку XIX ст. простежуються зміни у внутрішньому облаштуванні церков. Трансформація відбувалася в переході від грецького типу (з іконостасом) до латинського (з відкритим вівтарем, бічними вівтарями і феретронами). У великій кількості храмів спостерігався синтез, якому була властива наявність і іконостаса, і пристінних вівтарів. У другій половині XVIII ст. досить часто в церквах перебували феретрони − виносні процесійні вівтарики, використання яких в уніатській практиці вкоренилося під впливом церкви.

Серед колишніх греко-католицьких церков, які діють тепер як православні, були виявлені ті, де збереглися уніатські іконостаси та / або пристінні вівтарі. Потрібно констатувати, що таких пам’яток є зовсім не багато. До їх числа належать бічні вівтарі в храмі села Збироги Брестського р-ну, іконостас і вівтарі в церкві села Олтуш Малоритського р-ну (обидва в Брестській області); іконостас і феретрон з церкви в г.п. Шерешево Пружанського р-ну Брестської області, що зберігаються в Національному художньому музеї Республіки Білорусь.

В результаті дослідження було встановлено, що до другої чверті XVIII ст. у низці храмів інтер’єр зберігався в колишньому вигляді, сформованому на грецький лад. За другу чверть цього століття зміни, які відбувалися, переважно стосувалися появи бічних вівтарів, а при цьому досить часто зберігалися іконостаси. А ось в кінці XVIII ст. − на початку XIX ст. вже більше храмів були обладнані на латинський лад. Незважаючи на ці зміни, показово, що в Брестському офіціалаті до моменту скасування унії досить багато храмів, порівняно з церквами інших єпархій, зберігали іконостаси.

*Ключові слова:* греко-католицька церква, уніатська церква, Берестейський офіціалат, Володимиро-Брестська уніатська єпархія, інтер’єр храму, іконостас, пристінний вівтар, феретрон

Да пытанняў вывучэння абсталявання сакральных інтэр’ераў нам даводзілася звяртацца і раней у папярэдніх публікацыях. Дагэтуль намі разглядаліся грэка-каталіцкія цэрквы Кіеўскай і Полацкай архіепархій, а таксама – асобных дэканатаў разглядаемай тут Уладзіміра-Брэсцкай епархіі: Пружанскага, Кобрынскага, Уладаўскага. Аднак комплекснае вывучэнне храмаў названай тэрытарыяльна-царкоўнай адзінкі дагэтуль не праводзілася ні намі, ні нашымі папярэднікамі. Пэўныя напрацоўкі па дадзенай праблеме маюцца ў польскіх і украінскіх калег, якія ў сваіх работах разглядалі асобныя тэрыторыі або царкоўна-адміністрацыйныя адзінкі. Аднак абраны намі для даследавання рэгіён у гэтым аспекце з’яўляецца не вывучаным. Такім чынам, дадзеная тэма з’яўляецца новай і мала даследаванай.

Згаданыя вышэй нашыя даследаванні ажыццяўляліся метадам рэтраспекцыі, бо на беларускіх землях амаль не захаваліся прыклады храмавых інтэр’ераў, сфарміраваныя ў часы Уніі, так як пры скасаванні гэтай канфесіі і пераводу цэркваў у праваслаўе ўнутранае абсталяванне істотна мянялася. Таму вывучаць гэтае пытанне магчыма толькі пры прыцягненні гістарычных дакументаў, дзе ўтрымліваюцца звесткі пра выгляд храмавых інтэр’ераў. Што і будзе зроблена пры даследаванні трансфармацыі інтэр’ераў уніяцкіх цэркваў названага рэгіёну ў XVIII ст. *Мэта* дадзенага артыкула заключаецца ў навуковай рэканструкцыі ўнутранага выгляду грэка-каталіцкіх цэркваў Брэсцкага афіцыялату Уладзіміра-Брэсцкай епархіі.

*Актуальнасць* гэтай навуковай праблемы заключаецца ў тым, што на дадзеным этапе паўстае рэгулярна неабходнасць у стварэнні тэматычных экспазіцый у беларускіх музеях, ёсць патрэба ў афармленні інтэр’ераў колішніх уніяцкіх цэркваў, якія цяпер, як музейныя экспанаты, прадстаўлены ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту. Акрамя таго, неабходным з’яўляецца выяўленне грэка-каталіцкіх артэфактаў у дзеючых храмах (цяпер яны функцыянуюць як праваслаўныя), бо шматлікія цэрквы ўключаны ў шэраг турыстычных маршрутаў. А пры дэманстраванні наведвальнікам сакральных прадметаў з часоў Уніі ёсць магчымасць раскрыць больш поўна гісторыю царквы ў прыватнасці і гісторыю рэлігіі на Беларусі ўцэлым.

Уладзіміра-Брэсцкая грэка-каталіцкая епархія ўключала заходнюю частку Брэсцкага і паўночна-заходнюю Луцкага ваяводства. Беларускія тэрыторыі і Падляшша, т.зв. “Літоўская” частка ўваходзілі ў склад Брэсцкага афіцыялату, а “Каронная” частка – у склад Уладзімірскага [1, с. 6]. У дадзенай рабоце мы абмяжуемся разглядам храмаў менавіта Брэсцкага афіцыялату, бо ён уяўляў сабой асобную царкоўна-адміністрацыйную адзінку названай епархіі і ахопліваў этнічныя беларускія тэрыторыі. Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай гэтыя тэрыторыі патрапілі ў склад Расійскай імперыі, дзе неаднаразова з канца XVIII ст. мяняўся адміністрацыйны падзел уніяцкіх епархій. На момант скасавання Уніі прыходы былога Брэсцкага афіцыялату былі ў складзе Літоўска-Віленскай епархіі.

На жаль, дакументы да-замойскага перыяду (да 1720 г.) з апісаннямі храмаў гэтага рэгіёну нам не вядомыя (пры гэтым захаваліся комплексы крыніц канца XVII – пачатку

XVIII ст. па Уладзімірскім афіцыялаце [2]). Аднак у пытанні наяўнасці гістарычных крыніц Брэсцкі афіцыялат істотна вылучаецца сярод іншых рэгіёнаў тым, што па ім захаваліся поўныя пратаколы дзвюх генеральных візітацый: за 1725–1727 гг. [3] і 1759 г. [4; 5]. У гэтых дакументах прыведзены звесткі пра цэрквы Пружанскага, Кобрынскага, Камянецкага, Палесскага, Уладаўскага, Брэсцкага, Мельніцкага, Драгічынскага, Бельскага і Бяльскага дэканатаў. Такім чынам, у дадзеных візітах ахоплены вялікі рэгіён. Каштоўнасцю з'яўляецца тое, што дзве названыя візітацыі дазваляюць адсачыць трансфармацыю храмавых інтэр'ераў за чвэрць стагоддзя ва ўсім Брэсцкім афіцыялаце. Праўда, на жаль, вельмі мала крыніц па названым рэгіёне захавалася за пачатак XIX ст. А апісанні храмаў, якія асвятляюць стан цэркваў гэтай мясцовасці незадоўга да скасавання Уніі, пакуль што выявіць не ўдалося.

З найбольш ранняй з названых крыніц вынікае, што ў 1720-ыя гг. іканастасы знаходзіліся ў пераважнай большасці цэркваў Брэсцкага афіцыялату. Толькі адзінкавыя храмы тут былі ўладкаваны ў гэты час на лацінскі лад. І ў некаторых выпадках, дарэчы, пра гэта візітатар і адзначыў у адпаведнай фармулёўцы. Так, напрыклад, пры апісанні царквы Яна Евангеліста в. Кустын Брэсцкага дэканату (Брэсцкі р-н Брэсцкай вобл.) гаворыцца: "Царква малая, зроблена накшталт рымскага касцёла, без іканастаса і Царскай Брамы" [3, арк. 183 адв.]. Такія нататкі выклікаюць цікавасць, бо для правяраючага, відавочна, натуральным і тыповым уніяцкім інтэр'ерам з'яўляўся той, у якім меўся іканастас. А вось яго адсутнасць і наяўнасць толькі прысценных алтароў у візітатара адразу ж выклікала адпаведныя асацыяцыі з касцёлам. Асабліва цікавым гэта выглядае ў кантэксце параўнання з храмамі Кіеўскай архіепархіі прыблізна за той жа перыяд, дзе лацінскі тып інтрэр'ера быў настолькі натуральным і распаўсюджаным, што не выклікаў ніякага здзіўлення і не патрабаваў дадатковых тлумачэнняў, удакладненняў ці спецыяльных запісаў у пратаколах.

Яскравай асаблівасцю цэркваў Брэсцкага афіцыялату ў гэты час з'яўляецца амаль паўсюдная наяўнасць мясцовых алтароў. Мясцовы алтар – унікальная самабытная з'ява, якая сфарміравалася ў рэчышчы Уніі і выступала ўвасабленнем сінтэзу ўсходне- і заходнехрысціянскай традыцый. Да абразоў мясцовага чыну іканастаса падстаўляліся менсы (прастолы) і яны пераўтвараліся ў так званыя "мясцовыя алтары" – менавіта гэты тэрмін шырока выкарыстоўваўся ў справаводстве ўніяцкай царквы ў XVIII – пачатку XIX ст. Так, амаль у кожным іканастасе ў гэты час абразы ніжняга чыну ўжо былі з падстаўнымі менсамі. Даволі часта пры іх апісанні гаворыцца, што яны "убогія", "без усялякіх аздобаў". Такія характарыстыкі сустракаюцца даволі часта ў візітах цэркваў розных дэканатаў Брэсцкага афіцыялату: напрыклад, у царкве Св. Міхаіла в. Вітараж Бяльскага дэканату (Польшча) былі "пяць мясцовых абразоў з трыма ўбогімі алтарыкамі" [3, арк. 310 адв.], у царкве Св. Параскевы в. Лысаў Драгічынскага дэканату (Польшча) – "чатыры мясцовыя абразы з убогімі алтарыкамі" [3, арк. 350 адв.], у царкве Св. Міхаіла в. Гарбанька Кобрынскага дэканату (паселішча не існуе) – "чатыры мясцовыя абразы з убогімі алтарыкамі" [3, арк. 419 адв.].

З шэрагу апісанняў вынікае, што гэтыя сакральныя аб’екты былі аздоблены разьбяным дэкорам, балдахінам і/або крыламі: так, у царкве Св. Мікалая в. Опаль Уладаўскага дэканату (Польшча) былі “чатыры мясцовыя абразы з алтарыкамі, адзін з іх – “Беззаганнае Зачацце” – разьбяной работы, з калонымі, крыламі і з верхам” [3, арк. 282], у царкве Св. Параскевы в. Дакудаў Бяльскага дэканату (цяпер – Дакудаў Першы, Польшча) – “чатыры мясцовыя абразы з алтарыкамі, з калоннамі, рамамі і вярхамі, прыстойна для святой імшы прыбраныя” [3, арк. 301]; у царкве Міхаіла Арханёла в. Васкрынічы Бяльскага дэканату (цяпер – в. Выскрынічы Вялікія, Польшча) – “тры мясцовыя абразы з алтарыкамі, аздобленымі сталярнай работай” [3, арк. 308 адв.], у царкве Св. Апосталаў Пятра і Паўла в. Гусь Мельніцкага дэканату (Польшча) – “тры мясцовыя абразы з алтарыкамі, адзін з іх аздоблены дэкорам, сталярнай работы” [3, арк. 322].

Цікава, што класічных прысценных бакавых алтароў у храмах Брэсцкага афіцыялату было вельмі мала. У сярэднім яны сустракаліся толькі ў чацвёртай – пятай частцы цэркваў. А ў некаторых дэканатах яны ўвогуле былі адзінкавымі. Напрыклад, у Палескім дэканаце бакавыя прысценныя алтары ў 1720-ыя гг. былі толькі ў Мікалаеўскай царкве в. Верхалессе (Кобрынскі р-н Брэсцкай вобл.) [3, арк. 258 адв.]. Абагульняючы прыведзеныя вышэй звесткі пра цэрквы Брэсцкага афіцыялату ў 1720-ыя гады, адзначым, што ў большасці храмаў былі іканастасы з мясцовымі алтарамі, бакавыя прысценныя алтары і ферэтроны сустракаліся не часта; галоўныя алтары фігуруюць ва ўсіх апісаннях, аднак пад гэтай тэрміналогіяй візітатары маглі мець на ўвазе прастол у віме царквы, усталяваны па ўсходнім абрадзе.

Нельга не адзначыць адну цікавую асаблівасць дадзенай архіўнай справы: тут пры апісанні вялікай колькасці цэркваў гаворыцца пра наяўнасць у іх “маскоўскіх” абразоў [6]. Такія іконы пераважна згадваюцца як другасныя, найменш значныя. Іх сюжэты і месца размяшчэння ў царкве звычайна не зафіксаваны ў крыніцах. Аднак маюцца і цікавыя прыклады, калі такія абразы знаходзіліся ў іканастасах або алтарах. Напрыклад, у царкве Стрэчання в. Стрыгава Кобрынскага дэканату (Кобрынскі р-н Брэсцкай вобл.) у мясцовым чыне іканастаса знаходзіліся чатыры маскоўскія абразы з алтарыкамі, а таксама маскоўскі абраз Божай Маці размяшчаўся ў галоўным алтары [3, арк. 422]. Па адным маскоўскім абразку, пра якія гаворыцца, што яны – малыя, было ў галоўных алтарах царквы Св. Троіцы в. Пужычы (не існуе) і царквы Успення в. Зводы Камянецкага дэканату (цяпер – Малыя Зводы, Камянецкі р-н Брэсцкай вобл.), а таксама ў царкве Апекі Божай Маці в. Хабовічы Кобрынскага дэканату (Кобрынскі р-н Брэсцкай вобл.) [3, арк. 174 адв., 177, 424 адв.]. Па дзве іконы такога паходжання было ў галоўных алтарах царквы Св. Мікалая в. Любень Уладаўскага дэканату (Польшча) і царкве Сімяона Слупніка в. Велямовічы Брэсцкага дэканату (Брэсцкі р-н Брэсцкай вобл.) [3, арк. 179 адв.]. У царкве Міхаіла Арханёла в. Ставы Брэсцкага дэканату (Камянецкі р-н Брэсцкай вобл.) у галоўным алтары знаходзіліся чатыры маскоўскія абразы [3, арк. 178].

Такія ж творы размяшчаліся ў той час і ў некаторых іканастасах храмаў Брэсцкага афіцыялату. Так, у Троіцкай царкве в. Ракітна Бяльскага дэканату (Польшча) уверсе іканастаса 12 былі розных абразоў, сярод якіх былі і маскоўскія [3, арк. 307 адв.]. А ў царкве Нараджэння Божай Маці в. Жыцін Камянецкага дэканату (Жабінкаўскі р-н Брэсцкай вобл.) у мясцовым чыне іканастаса знаходзілася пяць маскоўскіх абразоў (без алтароў) [3, арк. 148 адв.].

У названай справе фігуруе і іншая геаграфічная назва, якая ўказвае на паходжанне сакральных твораў. Так, у Мікалаеўскай царкве в. Радасць Камянецкага дэканату (Камянецкі р-н Брэсцкай вобл.) знаходзіліся “папяровыя” італьянскія абразы [3, арк. 140]. Відавочна, што гаворка ў дадзеным выпадку ідзе пра гравюры. А ў царкве Нараджэння Божай Маці в. Макраны Палескага дэканату (Маларыцкі р-н Брэсцкай вобл.) наўпрост і гаворыцца, што “іканастас з “Апосталамі” італьянскага друку, папяровымі” [3, арк. 255 адв.]. Гэтыя прыклады з’яўляюцца надзвычай цікавымі, бо сведчаць пра тое, што гравюры выкарыстоўваліся ў храмах не толькі для развескі па сценах, але і для ўсталявання ў іканастасе.

Яшчэ адзін прыклад выкарыстання ў іканастасе “чужародных” абразоў, праўда ў крыху больш позні час, датычыцца царквы Міхаіла Арханёла в. Волька Бельскага дэканату (цяпер – Вулька, Польшча) за 1759 г. Тут у іканастасе размяшчаліся абразы Апосталаў “філіпаўскай работы”: “Іканастас з “Архірэем” і 12 “Апосталамі” філіпаўскай работы”[4, с. 944–945]. Такое азначэнне не выклікае сумневаў, што гаворка ідзе пра іконы, выкананыя старaабраднікамі. Хоць гэты выпадак з’яўляецца адзіным, з нам вядомых, калі ў іканастасе ўніяцкай царквы размяшчаліся старaабрадніцкія іконы, аднак нам сустракаліся іншыя прыклады, калі проста ў інтэр’ерах грэка-каталіцкіх храмаў знаходзіліся абразы такога паходжання. Так, у царкве Кузьмы і Дзям’яна м. Высока-Мазавецкае таго ж дэканату (Польшча) ў 1759 г. знаходзіўся невялікі філіпаўскі абразок Багародзіцы [4, с. 836]. У гэты ж час у царкве Нараджэння Яна Хрысціцеля в. Пішчац Бяльскага дэканату (Польшча) было пяць абразоў такога паходжання [4, с. 454]. Адзначым, што яшчэ адзін вядомы нам прыклад існавання філіпаўскіх абразоў ва ўніяцкай царкве датычыцца Турава-Пінскай епархіі, дзе ў 1777 г. у храме Св. Троіцы в. Глушкавічы Убарцкага дэканату (Лельчыцкі р-н Гомельскай вобл.) з іх быў зроблены цыборый [7, арк. 20–20 адв.].

Наступныя пасля 1720-х гг. паводле храналогіі вядомыя нам крыніцы па храмах Брэсцкага афіцыялату – візіты за 1757 г. Брэсцкага дэканата [8]. Тут маюцца цікавыя прыклады апісання інтэр’ераў. Так, у вялікай колькасці выпадкаў згадак пра іканастас, Царскую Браму, дыяканскія дзверы няма, аднак пры гэтым апісваюцца мясцовыя алтары. Пры чым менавіта з выкарыстаннем прыведзенага словазлучэння. Акрамя мясцовых, у дакументах фігуруюць і бакавыя алтары, што сведчыць пра свядомы выбар візітатарам адпаведнай тэрміналогіі. Аднак менавіта такія выпадкі, калі з усіх кампанентаў іканастаса згадваюцца толькі мясцовыя алтары, ускладняюць сістэматызацыю цэркваў паводле тыпу інтэр’ераў, бо не зразумела, ці

існаваў там усё ж іканастас з Царскай Брамай, ці толькі і засталіся ад яго рэшткі ў выглядзе мясцовых алтароў. Пры чым заўважым, што такіх храмаў была прыблізна пятая частка ад агульнай колькасці. А акрамя таго, было і даволі шмат цэркваў, пры апісанні якіх згадваюцца, акрамя мясцовых алтароў, яшчэ і Царскія Брамы. У гэтых выпадках можна весці гаворку пра існаванне аднаяруснага іканастаса [8].

Наступныя паводле храналогіі крыніцы, якія даюць ўяўленне пра асаблівасці ўладкавання царкоўных інтэр’ераў – візіты ўсяго афіцыялату за 1759 г. (прадстаўлены ў дзвюх справах) [4; 5]. За чвэрць стагоддзя, якая мінула ад моманту папярэдняй згаданай вышэй генеральнай праверкі, ва ўнутранай царкоўнай прасторы адбыліся пэўныя змены. Так, у гэты час у большасці храмаў ужо існавалі прысценныя алтары. Натуральна, што яны былі ў тых цэрквах, дзе іканастасы зніклі і інтэр’ер набыў касцёльны выгляд, аднак акрамя таго, яны з’явіліся і ў храмах, дзе працягвалі захоўвацца іканастасы [9–12]. Адзначым, што найбольшая колькасць храмаў, аздобленых на лацінскі лад, у гэты час была на Падляшшы. Так, у Мельніцкім, Драгічынскім і Бельскім дэканатах прыблізна ў палове цэркваў у 1759 г. былі толькі прысценныя алтары. Дарэчы, тое ж назіралася і ў Брэсцкім дэканаце [4]. Цікава, што гэтыя тэндэнцыі найбольш праявіліся ў самых заходніх дэканатах афіцыялату, а тыя, якія былі з усходняга і паўднёвага боку разглядаемай царкоўна-адміністрацыйнай адзінкі, больш актыўна захоўвалі грэчаскія атрыбуты. Так, ва Уладаўскім і Пружанскім дэканатах толькі па дзве царквы былі без іканастасаў [5].

Больш за тое, у гэты час не толькі захоўваліся старыя іканастасы ранейшых часоў, а нават усталёўваліся новыя. Гэта датычыцца Мікалаеўскага храма ў в. Опаль Уладаўскага дэканату (Польшча), дзе “іканастас яшчэ не ўсталяваны, для якога ўжо прыгатавана Царская Брама, абраз Архірэя і абразы Свв. Апосталаў з рамамі і іншымі аздобамі” [5, с. 386]. У царкве Нараджэння Яна Правазвесніка в. Пішчац Бяльскага дэканату (Польшча) іканастас таксама быў новым [4, с. 454]. Надзвычай цікавы запіс маецца ў візіце філіяльнай капліцы ў в. Страдзечы Брэсцкага дэканату (Брэсцкі р-н Брэсцкай вобл.), прыпісанай да замкавай царквы ў Кодані (Польшча). Тут гаворка ідзе не толькі пра тое, што іканастас зроблены новы, а нават згадваецца фундатар: “… коштам яснавяльможнага пана Аўсянага, чэсніка Ваўкавыскага, паводле грэчаскага абраду з “Архірэем”, “Апосталамі”, “Прарокамі”, “святамі”, Царскай Брамай і двума мясцовымі прастоламі, прыгожы” [4, с. 300]. Звяртае на сябе ўвагу тая акалічнасць, што іканастас адразу ж быў змайстраваны з мясцовымі алтарамі. Такія прыклады ў той жа час былі вядомы і ў іншых епархіях. А ў разглядаемым Брэсцкім афіцыялаце гэта, бадай, адзіны дакладна зафіксаваны такі выпадак.

Усталёўваліся ў храмах і новыя брамы. У царкве в. Яблычна таго ж дэканату (Польшча) пра дыяканскія дзверы адзначана, што яны яшчэ не фарбаваныя [4, с. 357]. А, напрыклад, у Палескім дэканаце ў гэты ж час пра некалькі Царскіх Брамаў гаворыцца, што яны новыя: у царкве Св. Параскевы в. Дзівін (Кобрынскі р-н Брэсцкай вобл.), Нараджэння Маці Божай в. Лукава, Сімяона Слупніка в. Збураж (абедзьве – Маларыцкі р-н Брэсцкай вобл.) [5, с. 180, 190, 205]. Цікава, дарэчы,

што ў старых іканастасах часам былі новыя Царскія Брамы, што сведчыць пра прыхільнасць святара да ранейшых традыцый і яго дбанне пра аднаўленне галоўнага сакральнага аб'екта храма. Так, у 1759 г. у старым іканастасе царквы Св. Мікалая м. Кобрын (Кобрынскі р-н Брэсцкай вобл.) была новая разьбяная брама [5, с. 101]. А пры апісанні царквы Узвядзення Крыжа в. Дабратычы Брэсцкага дэканату (Польшча) нават адзначаецца, за чые грошы былі зроблены новыя іканастасныя дзверы: часткова за сродкі святара, часткова – прыхаджан [4, с. 266–267].

У гэты ж час на сродкі фундатараў ва ўніяцкіх цэрквах уладкоўваліся і "атрыбуты лацінства" – бакавыя прысценныя алтары. Цікавы запіс на гэты конт прысутнічае ў візіце 1759 г. царквы Міхаіла Арханёла в. Ставы Брэсцкага дэканату (Камянецкі р-н Брэсцкай вобл.): "Бакавыя алтары новыя, разьбяныя, з калонамі, капітэлямі, прамянямі.. адзін коштам БенедыктаВаўрушэвіча, суррагата капітулы Брэсцкай і плябана стаўскага, а другі – коштам брацтва…" [4, с. 189–190]. Гэты запіс дае ўяўленне пра тое, як адбываўся працэс пераабсталявання храмавых інтэр'ераў.

З архіўных крыніц адкрылася і невядомае дагэтуль імя мастака, які ў пачатку XIX ст. прыводзіў у належны выгляд галоўны алтар, некаторыя абразы, ды і інтэр'ер увогуле ў царкве в. Брашэвічы на Палессі (Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл.). Так, у 1811 г. з бярозаўскім мастаком Антоніям Ганчаркам быў заключаны кантракт на адпаведныя віды работ. Калі не браць у разлік імёны мастакоў, напісаныя на абразах, то гэта – рэдкі выпадак, калі стала вядома імя майстра, які працаваў над жывапіснымі заказамі ва ўніяцкіх храмах [13]. Падкрэслім, што майстар быў местачкоўцам Бярозы – паселішча ў Брэсцкім афіцыялаце.

На жаль, іншыя пратаколы генеральных візітацый усяго Брэсцкага афіцыялату, якія б дазволілі комплексна ў гэтай мясцовасці прасачыць за зменамі інтэр'ераў, нам не вядомыя. Маюцца толькі візіты асобных дэканатаў канца XVIII – пачатку XIX ст. Да іх ліку належаць пратаколы праверак Мельніцкага дэканату за 1774 і 1782 гг. [14; 15], Бельскага і Кобрынскага за 1784 г. [16; 17], Бельскага, Мельніцкага і Драгічынскага за 1797 г. [18], Кобрынскага і Камянецкага за 1802 г. [19; 20], Драгічынскага за 1804 г. [21]. Такім чынам, найбольш крыніц захавалася па Падляшшы. Пералічаныя матэрыялы сведчаць пра тое, што да пачатку XIX ст. у інтэр'ерах цэркваў гэтага рэгіёну працягвалі адбывацца змены: усё інтэнсіўней праяўляліся тэндэнцыі лацінізацыі, аднак не гледзячы на гэта, у значнай колькасці храмаў на канец XVIII ст. меліся і іканастасы.

Калі весці гаворку пра паэтапныя пераўтварэнні, то звяртае на сябе ўвагу, што за чвэрць стагоддзя паміж візітацыямі 1759 і 1784 гг. у Бельскім і Кобрынскім дэканатах колькасць храмаў з іканастасамі скарацілася на траціну. Так, калі ў 1759 г. іх было 16 і 15 адпаведна па названых дэканатах, то ў 1784 г. стала 11 і 10. Цікава, што ў прыватнасці ў Кобрынскім дэканаце, па якім маюцца дакументы пачатку XIX ст., гэтыя лічбы засталіся без зменаў як мінімум да 1802 г. Праўда, да моманту скасавання Уніі ў 1839 г. колькасць зноў скарацілася амаль удвая, што вынікае са зводнай па ўсё Літоўскай епархіі, куды ўваходзілі ў той час і цэрквы колішняй

Уладзіміра-Брэсцкай епархіі, справы за 1837 г., пра якую больш падрабязна будзе сказана ніжэй [4, с. 812–972; 5; 16; 17; 19; 22].

Паказальна, што па Камянецкім дэканаце, за які таксама маюцца дакументы 1802 г., лічбы сведчаць пра тыя ж тэндэнцыі. Так, у 1759 г. у 24 цэрквах былі іканастасы, аднак на пачатак XIX ст. – толькі ў 12-ці. Пры чым у гэты час ні пра іканастасы, ні пра асобныя іх кампаненты (Царскія Брамы, дыяканскія дзверы, абразы) не гаворыцца, што яны новыя [20]. У Драгічынскім дэканаце на 1804 г. толькі ў дзвюх храмах працягвалі захоўвацца іканастасы. Гэты дэканат і ў сярэдзіне XVIII ст. адрозніваўся ад астатніх аналагічных царкоўна-адміністрацыйных адзінак Брэсцкага афіцыялату найбольшай ступенню лацінізацыі, а на пачатак XIX ст. яна набыла яшчэ большыя межы [21].

Асобна трэба сказаць пра з’яўленне фератронаў (вынасных працэсійных алтароў) у храмах рэгіёну. Так, у 1725−1727 гг. толькі ў адзінкавых цэрквах былі гэтыя культавыя рэчы. Больш за тое, у гэты час пераважна гаворка ідзе пра “абраз на століку для працэсій”. Звяртае на сябе ўвагу выкарыстанне тэрміналогіі: так, у больш позніх крыніцах часцей выкарыстоўваецца тэрмін “алтарык”, а ў названай справе “абраз” [3]. З аднаго боку гэта проста можа сведчыць пра паняційны апарат візітатара (хаця ў гэтым назіраецца яго сістэма мыслення, якая адлюстроўвае звыкласць ці наадварот нетыповасць для яго пэўных сакральных аб’ектаў), аднак з іншага гаворыць пра асаблівасці выгляду і магчымых варыянтаў выкарыстання гэтых рэчаў. Так, вынасны алтарык мог, верагодна, акрамя працэсій, выкарыстоўвацца і як звычайны бакавы алтар для правядзення мессаў.

У справах за 1759 г. фератроны згадваюцца значна часцей. Аднак у гэты час у названым рэгіёне яны яшчэ былі не паўсюднай з’явай. Так, у некаторых дэканатах яны меліся ў трэцяй-чацвёртай частцы храмаў (Пружанскі, Кобрынскі, Камянецкі, Палескі) [5], аднак на Падляшшы яны былі больш шырока ўжыванымі і сустракаліся ў большай частцы цэркваў Бельскага, Драгічынскага і Мельніцкага дэканатаў [4]. Паказальна, што на пачатак XIX ст. у рэдкіх цэрквах Кобрынскага, Камянецкага, а асабліва Драгічынскага дэканатаў не было фератронаў [19–21].

На жаль, акрамя двух названых візітаў 1802 г. і адной за 1804 г., па XIX ст. па гэтай тэрыторыі крыніцы нам больш не вядомыя. Аднак па названым рэгіёне, як і па прыходах былой Кіеўскай і часткі Турава-Пінскай епархій, можна атрымаць звесткі са зводнага дакумента Літоўскай епархіі за 1837 г., у склад якой на той час уваходзілі цэрквы колішняй Уладзіміра-Брэсцкай епархіі. Так, у згаданай справе прыведзена інфармацыя пра цэрквы, дзе адзначаецца, ці існаваў іканастас спрадвеку, ці быў усталяваны ў апошнія гады. Па дэканатах былой Уладзіміра-Брэсцкай епархіі прыведзены наступныя лічбы: у Драгічынскім з 35 цэркваў (34 прыхадскія + 1 прыпісная) іканастасы спрадвеку былі ў пяці; у Камянецкім з 41-ой (28 прыхадскіх + 10 прыпісных + 3 капліцы) – у 11-ці; у Брэсцкім з 30-ці (23 прыхадскія + 4 прыпісныя + 3 капліцы) – у пяці; у Пружанскім з 27-мі – у

сямі; у Кобрынскім з 23-ох (21 прыхадская + 2 капліцы) – у шасці; у Бельскім з 41-ой (32 прыхадскія + 3 прыпісныя + 6 капліц) – у пяці.

Рэдкімі прыкладамі цэркваў, дзе захаваліся уніяцкія інтэр'еры або некаторыя з іх галоўных атрыбутаў, з'яўляюцца цэрквы ў в. Збірагі Брэсцкага р-на (*іл. 1*) і в. Олтуш Маларыцкага р-на Брэсцкай вобласці (*іл. 2*). У першай з названых да сярэдзіны XVIII ст. захоўваўся стары двух'ярусны іканастас [8, арк. 23 адв.]. На нейкім этапе ён быў, відавочна, заменены на новы, бо тая канструкцыя, якая зараз знаходзіцца ў царкве, відавочна, даволі позняя і можа быць датавана XIX ст. У справе за 1837 г. пра іканастас адзначаецца, што ён існаваў спрадвеку. Адсюль вынікае, што хоць замена і адбывалася старога іканастаса на новы, аднак увесь час у храме меўся адпаведны сакральны аб'ект. Акрамя яго, захаваліся, верагодна, на сваіх спрадвечных месцах барочныя бакавыя алтары. Усё гэта стварае ансамбль, які дае ўяўленне пра ранейшае спалучэнне ў інтэр'еры іканастаса з прысценнымі алтарамі.

Тыя ж самыя назіранні датычацца і храма Пераўтварэння Божага ў а.г. Олтуш Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл. У гэтым выпадку, як і з царквой в. Збірагі, наяўны комплекс дэманструе той варыянт абсталявання ўніяцкага інтэр'ера, калі іканастас суіснаваў з прысценнымі алтарамі.

На іканастасе ў царкве Пераўтварэння Божага а.г. Олтуш Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл. засяродзімся больш падрабязна, бо гэта рэдкі прыклад уніяцкага



*Іл. 1. Інтэр'ер былой уніяцкай царквы Св. Параскевы в. Збірагі Брэсцкага р-на Брэсцкай вобл. Фота М. П. Мельнікава і Ул. Р. Карэліна, 2008 г.*



*Іл. 2. Інтэр’ер былой уніяцкай царквы Праўтварэння Божага а.г. Олтуш Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл. Фота М. П. Мельнікава і Ул. Р. Карэліна, 2008 г.*

высокага іканастаса, які захаваўся да цяперашняга часу. Гэты помнік Э. Вецер датавала XVIII стагоддзем [23]. На жаль, з архіўных крыніц пра названы твор атрымаць інфармацыю не ўдалося. Адзінае, што можна пра яго сказаць, дык гэта тое, што ён быў змайстраваны пазней за 1759 г., бо ў візіце за гэты год пры апісанні олтушскай царквы фігуруе іншы іканастас [5, с. 434]. Вядома, што новы царкоўны будынак на месцы папярэдняга быў узведзены ў 1783 г. [24, с. 149], магчыма тады ж і быў зроблены існуючы іканастас. У любым выпадку, у зводнай справе за 1837 г., дзе прыведзены дадзеныя пра храмы Літоўскай епархіі, пра іканастас у олтушскай царкве адзначана, што ён “существовал издревле” [22, арк. 20 адв.]. А гэта азначае, што ён быў зроблены не тады, калі ў 1830-ыя гады вялося пераабсталяванне ўніяцкіх цэркваў, а раней. Стылістычна гэты помнік мае рысы барока і класіцызму. Хаця на нашую думку, такія іканастасы на беларускіх землях майстраваліся ажно да сярэдзіны XIX ст. Таму пытанне датавання гэтага помніка яшчэ чакае свайго больш пільнага даследавання, аднак на цяперашні момант з-за адсутнасці звестак спытімся на прынятай даце – канец XVIII ст. Паводле сваёй праграмы, кампазіцыі, стылістыкі, іканастас можна лічыць эталонным. Аднак адзначым, што ён з’яўляецца не самым тыповым прыкладам, бо ўніяцкія іканастасы даволі рэдка былі высокімі. Нас гэты помнік цікавіць яшчэ і па той

прычыне, што ён з’яўляецца часткай агульнага інтэр’ернага ансамбля, у які, акрамя яго, ўваходзяць бакавыя архітэктурныя алтары.

Комплекс іканастасных абразоў і фератрона захаваўся з царквы ў г.п. Шарашова Пружанскага р-на Брэсцкай вобласці [25, іл. 130–134] (*іл. 3*). Іканастасная структура не дайшла да нашага часу, але абразы з трох чыноў знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. Фотаздымак, на якім яны комплексна прадстаўлены, публікаваўся ў альбоме “Іканапіс Беларусі XV–XVIII стст.” [25, іл. 130]. Абразы з шарашоўскага іканастаса пры іх апублікаванні фігуруюць пад 1760-ымі гадамі (або пад другой паловай XVIII ст.), аднак на нашую думку, яны былі напісаны не пазней за першую трэць XVIII ст. Справа ў тым, што першая з названых датаў была прапанавана Н. Ф. Высоцкай на падставе таго, што ў 1760-ым годзе быў узведзены той царкоўны будынак, адкуль абразы патрапілі ў музей. Аднак такая падстава для датавання не можа з’яўляцца абгрунтаванай, бо абразы маглі быць перанесены ў новую царкву з папярэдняй, існаваўшай на гэтым месцы.

Прапанаваная намі дата – да 1725 г., базуецца на тым, што ў візіце за 1725 г. пры апісанні царквы згадваецца, акрамя іканастаса, абраз “Тры Святцелі” [3, арк. 128],



*Іл 3. Іканастасныя абразы са страчанай царквы г.п. Шарашова Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. НММ РБ*

які захаваўся да нашага часу і выкананы, відавочна, тым жа майстрам, які працаваў і над напісаннем абразоў Апосталаў (абразы святочнага ярусу, верагодна, былі напісаны іншым мастаком). А гэта дазваляе і абразы апостальскага чыну датаваць тым жа перыядам.

Такая ж думка актуальна і ў дачыненні да абразоў святочнага цыкла. На жаль, у вядомых нам дакументах па гэтай царкве (1725 і 1759 гг.) згадак пра іконы Божых і Багародзічных святаў увогуле няма. Аднак у візіце за 1725 г. адзначаецца, што “deisus porządny…” [3, арк. 128], а ў дакуменце за 1759 г. пра гэтую сакральную канструкцыю гаворыцца, што яна старая [5, с. 89]. Адсюль вынікае, што ў храме працягваў захоўвацца той жа іканастас, што быў згаданы ў папярэднім дакуменце і на гэты час ён ужо лічыўся старым. Змест яго радоў у дакуменце не пазначаны, гаворыцца, што іканастас у тры чыны. Аднак у большасці выпадкаў візітатары XVIII ст. пры апісанні іканастасаў ніжні рад у агульную колькасць не ўключалі, а падлічвалі толькі верхнія ярусы. Таму, на нашую думку, ён мог складацца з мясцовага, святочнага, апостальскага і прарочага чыноў.

У 1760 г. сапраўды быў узведзены новы будынак. У крыніцы за 1818 г. падрабязна зафіксаваны звесткі пра іканастас, як быў уладкаваны пасля гэтай падзеі: “Паступіў у царкву іканастас, у якім уверсе “Пракрокі”, ніжэй – Апосталы, яшчэ ніжэй таямніцы святаў Хрыста Збавіцеля і Дзевы Марыі, напісаныя на дошках… Царская Брама разьбяная, пазалочаная, месцамі пасярэбраная, у якой разьбяныя асобы чатырох евангелістаў і Дабравесця Божай Маці, каля іх два алтары” [26].

Гэтае апісанне адпавядае таму іканастасу, які захаваўся (сапраўды ў Царскай Браме былі менавіта разьбяныя, а не жывапісныя выявы Евангелістаў) з той толькі розніцай, што цалкам страчаны абразы Прарокаў. Даследчыкі адзначаюць, што на нейкім этапе існавання іканастас быў крыху перароблены: верхні ярус дэманціраваны, а цэнтральны абраз з яго – “Божая Маці Прадвесце” спушчаны пад ікону “Дэісус”, дзе ён заняў месца цяпер ўжо ў цэнтры святочнага яруса. Прарочы ярус, напэўна, буў перададзены ў нейкую іншую царкву ў XIX ст., калі ішла масавая кампанія па ўсталяванні іканастасаў ва ўніяцкіх цэрквах ў 1830-ыя або пасля паўстання К. Каліноўскага ў 1860-ыя гг., калі касцёлы пераводзіліся ў праваслаўнае ведамства, што суправажалася ўсталяваннем там іканастасаў. Аднак няма сумневу, што тыя творы, якія захаваліся, паходзяць менавіта з алтарнай агароджы яшчэ старога будынка і пры ўзвядзенні храма ў 1760 г. іканастас быў туды перанесены ранейшы, а не зроблены новы.

Выказаць меркаванне пра падобны лёс разглядаемай групы абразоў дазваляюць некалькі акалічнасцяў. Перш за ўсё, уласна стылістыка і іканаграфія твораў. Даследчыкамі, якія звярталіся да святочных абразоў шарашоўскага чыну, неаднаразова адзначалася пра захоўванне ў гэтых помніках, створаных быццам бы ў эпоху сталага барока, архаічных (рэнесансных) мастацкіх формаў: “Майстры, якія працавалі над яго (іканастаса) стварэннем, верагодна,

ў 60–70-я гады XVIII ст., выказваюць надзвычай паслядоўную прыхільнасць традыцыйнаму канону мясцовай праваслаўнай іканаграфіі XVII ст. Пачынаючы ад агульнай кампазіцыйнай структуры іканастаса і заканчваючы асобнымі дэталямі кампазіцыі святочных абразоў – усё падпарадкавана мэце захавання "старыны" [27, с. 185–186]. Гэтаму знаходзілі шэраг тлумачэнняў, аднак найбольш відавочная версія – пра памылковасць датавання другой паловай XVIII ст. і прыналежнасць комплекса да больш ранняй эпохі – так і не была выказана. На нашую ж думку, такая стылістыка абразоў "пад даўніну" і тлумачыцца тым, што яны былі створаны як мінімум на паўстагоддзя раней за агульна прынятую дату. У любым выпадку, існуючы на цяперашні час комплекс абразоў дае даволі яскравае ўяўленне пра адзін з варыянтаў праграмы трох'яруснага іканастаса ўніяцкага храма Беларусі.

Фератрон з шарашоўскай царквы, бадай, самы першы з уніяцкіх фератронаў, які патрапіў пад увагу даследчыкаў і быў апублікаваны [28, с. 144]. У публікацыях помнік фігуруе пад сярэдзінай – трэцяй чвэрцю XVIII ст. З дапамогай архіўных крыніц можна ўнесці пэўныя ўдакладненні. Так, у візітацыйных актах па дадзенай царкве за 1759 г. згадваецца фератрон, аднак з іншымі выявамі. Відавочна, што разглядаемы помнік з'явіўся ў храме пасля 1759 г.

Такім чынам, у выніку праведзенага даследавання было ўстаноўлена, што да другой чвэрці XVIII ст. у шэрагу храмаў інтэр'ер захоўваўся ў ранейшым выглядзе, сфарміраваным на грэчаскі лад. За другую чвэрць гэтага стагоддзя змены, якія адбываліся, пераважна датычыліся з'яўлення бакавых алтароў, а пры гэтым даволі часта працягвалі захоўвацца іканастасы. А вось у канцы XVIII ст. – пачатку XIX ст. ужо больш храмаў было абсталявана на лацінскі лад. Не гледзячы на гэтыя змены, паказальна, што Брэсцкі афіцыялат Уладзіміра-Брэсцкай епархіі вылучаўся тым, што тут ў даволі вялікай колькасці храмаў, у параўнанні з Кіеўскай і Полацкай архіепархіямі, даследаванымі намі раней, захоўваліся іканастасы. А ў чацвёртай частцы цэркваў (калі не ўлічваць капліцы, а браць у разлік прыхадскія і прыпісныя цэрквы) яны працягвалі знаходзіцца ажно да скасавання Уніі. Бакавых алтароў у часы Уніі з усіх гэтых храмаў не было толькі ў пары цэркваў і некалькіх капліцах Бельскага, Брэсцкага і Палесскага дэканатаў [22], хаця з'яўляцца яны тут пачалі даволі позна, бо ў 1720-ыя гг. яны яшчэ былі рэдкасцю. А вось мясцовыя алтары ў той час меліся ў пераважнай большасці цэркваў. Фератроны таксама тут сталі масавымі недзе толькі ў сярэдзіне XVIII ст.

1. Лісейчыкаў Дз. В. Святар у беларускім соцыуме: прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596–1839 гг. Мінск, 2015. 719 с., [16] л. іл.

2. Генеральні візитації церков і монастирів Володимирської унійної єпархії кінця XVII — початку XVIII століть: книга протоколів та окремі описи / заг. ред. та іст. нарис Анджей Ґіль, Ігор Скочиляс; упоряд. Анджей Ґіль, І. Макевич, Ігор Скочиляс, Ірина Скочиляс. Львів–Люблін, 2012. 279 с.

3. Archiwum Państwowe w Lublinie (APL). Chełmski Konsystorz Grecko-katolicki (CGKK). Sygn. 101.

4. Lietuvos mokslu akademijos biblioteka (LMAB). RS. F 41. Sygn. 225–394.

5. Lietuvos valstybes istorijos archyvas (LVIA). F. 634. Ap. 1. B. 48.

6. Флікоп-Світа Г. А. “Маскоўскія” абразы ва ўніяцкіх храмах Вялікага Княства Літоўскага ў XVII–XVIII стст. // Arche. 2015. № 12 (145): “Срэбны век”. С. 194–209.

7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41240. Арк. 20–20 адв.

8. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 50.

9. Флікоп Г. А. Абразы ў інтэр’ерах уніяцкіх цэркваў Пружанскага дэканата ў сярэдзіне XVIII ст. // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 2013. № 2. С. 68–79.

10. Флікоп Г. А. Іканастасы ва ўніяцкіх храмах Палескага дэканату ў др. пал. XVIII – 30-х гг. XIX стст. // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: сб. науч. ст. / ГрГУ им. Я. Купалы; редкол.: М. А. Можейко (гл. ред.) [и др.]. Гродно: ГрГУ, 2012. С. 210–214.

11. Флікоп Г. А. Іканастасы ў грэка-каталіцкіх храмах Уладаўскага дэканату ў сярэдзіне XVIII ст.: паводле візіты 1759 г. // Історія релігій в Україні: наук. щоріч. Львів: Інститут релігієзнавства, 2012. Кн. 2. Ч. 2. С. 471–483.

12. Флікоп Г. А. Размяшчэнне абразоў у інтэр’ерах уніяцкіх храмаў Кобрынскага дэканату ў др. пал. XVIII ст.: на матэрыяле архіўных крыніц // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў: матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, 10–11 лістапада 2011 г., г. Мінск / гал. рэд. А. І. Лакотка; Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Мінск: Права і эканоміка, 2011. С. 87–92.

13. LMAB. RS. F 43. Sygn. 6629.

14. APL. CGKK. Sygn. 121.

15. APL. CGKK. Sygn. 130.

16. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 51.

17. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 52.

18. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 55.

19. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 56.

20. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 57.

21. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 59.

22. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 4.

23. Ветер Э. И. Об особенностях белорусского иконостаса // Художественное наследие. Хранение, исследование, реставрация. 1978. № 4 (34). С. 187–192.

24. Кулагін А. М. Праваслаўныя храмы на Беларусі: Энцыкл. давед. Мінск: БелЭн, 2001. 328 с.: іл.

25. Іканапіс Беларусі XV–XVIII стагоддзяў / Аўтар тэксту і складальнік Н. Ф. Высоцкая. Мінск: Беларусь, 2001. 21 с.: [139] арк. іл.

26. Трыфанава Н. Я. З гісторыі шарашоўскай царквы Нараджэння Багародзіцы і яе ўнутранага аздаблення // Паведамленні Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Мінск: “Белпрынт”, 2007. Вып. 5. С. 147–152.

27. Шматаў В. Ф., Вецер Э. І., Мельнікаў М. П. і інш. Іканапіс Заходняга Палесся XVI–XIX стст. / навук. рэд. В. Ф. Шматаў; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы НАН Беларусі. Мінск: Бел. навука, 2002. С. 349 с.: іл.

28. Скульптура и резьба на Беларуси XII–XVIII веков: каталог / авт.-сост. Н. Ф. Высоцкая. Мінск: БелЭн, 1998. 224 с.: ил.

SUMMARY

**Halyna Flikop-Svyta**

**Iconostases and wall altars in the Greek Catholic churches of Brest officialt in the 17th century: features of coexistence**

The article examines the interiors of the Greek Catholic churches of the Brest officialt of the Vladimir-Brest diocese. Until now, a comprehensive study of the equipment of the temples of this territorial-administrative unit has not been carried out. Based on historical documents from the 1720s until the beginning of the 19th century, the authors trace changes in the internal arrangement of churches. Transformation took place in the transition from the Greek (iconostasis) to the Latin (with an open altar, side altars and veratrole). In a large number of temples there was a synthesis, which was characterized by the presence of an iconostasis, and wall altars. In the second half of the 18th century, quite often in churches were theratron-processional processional altars, the use of which in the Uniate practice took root under the influence of the Church.

Among the former Greek Catholic churches, now acting as Orthodox, were identified those where the Uniate iconostasis and / or wall altars were preserved. It should be noted that there are not many such monuments. To them belong the side altars in the Church of the village Zbirogi of the Brest district, the iconostasis and altars in the Church of the village Oltusz of the Malaryta district (both in the Brest region); the iconostasis and theratron of the Church in the town Sharashova, Pruzhany district of the Brest region that are stored in the National art Museum of the Republic of Belarus.

The study found that, prior to the second quarter of XVIII century in some churches the interior was kept in its original form, formed on Greek way. During the second quarter of this century, the changes that occurred mainly concerned the appearance of side altars, and at the same time quite often continued to persist iconostasis. But in the late 18th century – early 19th century more churches were equipped with a Latin twist. Despite these changes, it is significant that in the Brest officialt before the abolition of the Union in many churches, in comparison with the churches of other dioceses, the iconostasis were preserved.

*Keywords*: Greek Catholic Church, the Uniate Church, Brest officialt, Vladimir-Brest Uniate diocese, the Church interior, the iconostasis, the wall altar, feretory

DOI 10.33294/2523-4234-2019-29-1-299-309

**Олена Бакович**

# Конструктивні та мистецькі особливості іконостаса церкви Преображення Господнього в с. Підгір’я Золочівського району на Львівщині

Уперше розглянуто іконостас церкви Преображення Господнього в с. Підгір’я Золочівського району Львівської області. Визначено, що за типом конструкції він належить до групи багатоярусних, розірваних понаднамісним ярусом іконостасів, з чітко виділеною центральною вертикальною віссю композиції, великого розміру царськими вратами з наскрізною ажурною різьбою та винесеними над дияконськими вратами намісними іконами. Висвітлено мистецькі особливості виконання пам’ятки, що полягають у використанні насиченої кольорової гами, плавного світлотіньового моделювання площин тіла та контрастнішого вирішення драперій.

*Ключові слова:* іконопис, іконостас, конструкція іконостаса, мистецькі особливості, стилістика, ярус іконостаса